# СВЯТА З НАЦЫЯНАЛЬНЫМ КАЛАРЫТАМ

***Фестываль беларускага слова праходзіў на факультэце гуманітарыстыкі і моўных камунікацый у сёмы раз. Выкладчыкі кафедры беларускага мовазнаўства разам са студэнтамі зладзілі некалькі цікавых мерапрыемстваў, прасякнутых любоўю да роднай зямлі і беларускай мовы. Адзначу толькі некаторыя з іх.***



### БЕЛАРУСКІ КІРМАШ «ДЗЯКУЙ СКАЖАШ, ЯК З'ЯСІ»

Ужо ў першы дзень тыдня ўсе жадаючыя маглі наведаць «смачны» кірмаш і адчуць атмасферу традыцыйнага беларускага гандлю. Песнямі, гульнямі, танцамі і сапраўднымі беларускімі стравамі сустракалі кожнага, хто трапіў на шосты паверх. «Зоркай» кірмаша стаў нацыянальны пачастунак – дранікі.

Дарэчы, у Сярэднявеччы кірмаш быў адной з важных падзей у грамадстве. Купцы прыязджалі з розных гарадоў, прадавалі свае тавары і куплялі мясцовыя, а таксама абменьваліся навінамі. А яшчэ на кірмашах прысутнічалі варажбіты, музыканты, трубадуры, якія весялілі і забаўлялі пакупнікоў.

### ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКІХ РАМЁСТВАЎ

У гэтым годзе ў студэнтаў была магчымасць наведаць музей мастацка-графічнага факультэта і паўдзельнічаць у майстар-класах па ганчарству і саломапляценні. Сваімі ўражаннямі падзялілася староста 12-й групы Таццяна Вісоцкас:

«Нас сустрэла Таццяна Пятроўна Уласевіч, намеснік дэкана МГФ па вучэбнай рабоце, і правяла экскурсію не толькі па музеі, але і па выставачнай зале, дзе ў снежні экспануецца выстава «Прыбыццё. Платформа 25», прысвечаная 25-годдзю дзіцячай школы мастацтваў №3 «Маладзік». Мы былі ўражаны тым, што, нягледзячы на ўзрост (8 – 15 гадоў), вучні школы стварылі такія арыгінальныя работы.

У музеі мы пабачылі розныя цікавыя экспанаты. Асабліва нас уразіў партрэт Якуба Коласа, зроблены са сплаву рагоў свойскай жывёлы. Яшчэ ўсіх прысутных зацікавіў «трон» – крэсла, выкананае па індывідуальным заказе. Кажуць, калі сесці на яго і загадаць жаданне, то яно абавязкова збудзецца. Мы шчыра ў гэта паверылі, і кожны загадаў мінімум па адным. А як было весела прымяраць калядныя маскі! Так і хацелася выйсці ў іх на вуліцу і заспяваць «Шчодры вечар»!

### СПЕКТАКЛЬ ПА МАТЫВАХ ТВОРА «ПАЭМА ПРА ЯВАР І КАЛІНУ»

Пастаноўку падрыхтавалі студэнты факультэта разам з актрысай Беларускага тэатра «Лялька» Нінай Шабанавай. Адзін з «акцёраў», студэнт першага курса Архіп Громаў, падзяліўся сваімі ўражаннямі:

«Я вырашыў пайсці на кастынг на ролю галоўнага героя. Чаму? Па-першае, творчасць Уладзіміра Караткевіча люблю з дзяцінства, па-другое, даўно хацеў паспрабаваць сябе ў ролі акцёра. Рэпетыцыі праходзілі цікава. Усе былі настолькі захопленыя, што забываліся на час.

Прызнаюся, у мяне не адразу ўсё атрымлівалася, але з цягам часу мой голас стаў упэўненым і спакойным, жэстыкуляцыя – дакладнай. Намі была пракладзена велізарная дарога да бліскучага выступу, і авацыі падчас фінальнай сцэны былі заслужанымі.

Шчыра дзякую дэкану ФГіМК Сяргею Уладзіміравічу Нікалаенка за тое, што ён дазволіў прадэманстраваць свае таленты на вялікай сцэне, а таксама Ніне Мікалаеўне Шабанавай, выдатнаму майстру сцэны, за працу з нашай камандай».

**Дзіяна ГАЛАВАЧ,**
**студэнтка 3 курса ФГіМК.**